Алена БАГАМОЛАВА



* * *

*Не жыць як набяжыць!*
*А жыць, як плыць*
*Наперакор*
*Сустрэчным — недарэчным плыням!*
*А жыць, як узлятаць*
*Удзень — да сонца,*
*ўноч — да зор —*
*І лёс не здрадзіць!*
*Бог не пакіне!..*

* * *

*Заручаныя выпадкам,*
*Абвенчаныя жарсцю*
*І ёю спапялёныя,*
*Мы развіталіся*
*На скрыжаванні*
*Шляхоў, вятроў і сноў,*
*Дзе для прызнання*
*Не хапіла слоў...*
*і мудрасці...*

* * *

*Зайздрасць — пачвара*
*Ведае, дзе ўдарыць...*
*І што вынішчаць...*
*І як біць...*
*Вялізным смаўжом*
*Прыпаўзае,*
*Слізкай змяёй*
*Абвівае...*
*І ліпне... і душыць*
*чужыя натхненні,*
*прасветлыя душы...*

* * *

*Акрыленае небам,*
*Узнесенае ветрам,*
*На вастрыі ветаха —*
*На мяжы святла і цемрадзі,*
*На мяжы яснасці і бясконцасці,*
*На мяжы агню і ночы*
*Жыве маё натхненне,*
*Паланёнае імем тваім...*

* * *

*Так трывожна... як ніколі...*
*Абрушыўся на сэрца словапад*
*Тваіх нявыспелых, сумнеўных песняў,*
*Як на зямлю вясновую*
*Зіхоткі дажджапад,*
*Што сонечную далеч*
*Пункцірамі закрэсліў...*
*Вясёлцы быць?!.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ